Основной заботой педагога стала работа с отстающими студентами, в том числе за пределами его официального рабочего времени.

В докладе анализируются знания математических дисциплин, достигнутые в настоящее время бакалаврами направления ИВТ, по связи между результатами семестровых экзаменов и уровнями тесноты междисциплинарных связей между математическими и дисциплинами как общеинженерными, так и специальными [4]. Показана их слабая связь. Рассматриваются пути повышения математической подготовки в инженерных вузах [5].

ЛИТЕРАТУРА

1. Герасименко, П. В. Результаты ЕГЭ по математике и успеваемость: цели, статистика, анализ, предложения / П. В. Герасименко, В. А. Ходаковский // В сборнике: Проблемы математической и естественно-научной подготовки в инженерном образовании: исторический опыт, современные вызовы. Материалы научно-методической конференции. под общей редакцией В. А. Ходаковского. – 2011. – С. 38-51.
2. Тенденции и перспектива математического образования в технических вузах / В. П. Бубнов [и др.] // Известия Петербургского университета путей сообщения. – 2017. – Т. 14. – № 4. – С. 727-737.
3. Герасименко, П. В. О негативном влиянии результатов ЕГЭ по математике на подготовку специалистов в вузе и пути их устранении / П. В. Герасименко, В. А. Ходаковский // В книге: Проблемы математической и естественно-научной подготовки в инженерном образовании. Тезисы докладов 2-й международной научно-методической конференции. – 2012. – С. 172-173.
4. Благовещенская, Е. А. Математическое моделирование процесса изучения учебных многосеместровых дисциплин в технических вузах / Е. А. Благовещенская, П. В. Герасименко, В. А. Ходаковский // Известия Петербургского университета путей сообщения. – 2017. – Вып. 3. – С. 513-522.
5. Герасименко, П. В Путь реформирования математического образования в технических вузах: от фрагментарного до фундаментального и обратно / П. В. Герасименко // Актуальные проблемы преподавания математики в техническом вузе. – 2020. – № 8. – С. 80-87.

УДК 378 (06)

# ДРУГІ ВЫПУСК ЗААТЭХНІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ГРОДЗЕНСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА

**В. У. Галубовіч, В. П. Галубовіч**

УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт” (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле прадстаўлены вынікі рэканструкцыі калектыўнага партрэта другога выпуску заатэхнічнага факультэта Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута.

Ключавыя словы: адукацыя, сельская гаспадарка, студэнт, універсітэт.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

# ВТОРОЙ ВЫПУСК ЗООТЕХНИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА ГРОДНЕНСКОГО СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ИНСТИТУТА

**В. В. Голубович, О. П. Голубович**

УО "Гродненский государственный аграрный университет" (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье представлены результаты реконструкции коллективного портрета второго выпуска зоотехнического факультета Гродненского сельскохозяйственного института.
Ключевые слова: образование, сельское хозяйство, студент, университет.

# THE SECOND ZOOTECHNICAL DEPARTMENT GRADUATES OF GRODNO AGRICULTURAL INSTITUTE

**V. U. Halubovich, V. P. Halubovich**

EI «Grodno state agrarian university» (Republic of Belarus, 230008, Grodno, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article presents the results of the collective portrait reconstruction of the second zootechnical department graduates of Grodno agricultural institute.
Key words: education, agriculture, student, university.

Набор студэнтаў на першы курс у Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут (далей – ГСГІ) адбыўся ў 1951 г. [1, с. 5; 2, с. 23]. Найбольшай папулярнасцю карыстаўся агранамічны факультэт, але жадаючых паступіць на заатэхнічнае аддзяленне таксама не бракавала.

*Колькасць выпускнікоў.* Надзейнай крыніцай інфармацыі пра выпускнікоў-заатэхнікаў з'яўляецца архіўная справа, відавочна, пачатая ў інстытуце ў 1951 г. (згодна з арыгіналам справы, у 1952 г.) і закончаная ў 1956 г. [3]. Зводны рэестр да гэтай справы ўтрымлівае спіс з 67 прозвішчаў. Аднак выпіскі з загадам дырэктара ГСГІ пад № 36 ад 3.04.1956 г. аб рашэнні Дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі і выдачы дыплома з прысваеннем кваліфікацыі вучонага заатэхніка ўтрымліваюцца толькі ў 66 асабістых справах. Розніца ўзнікла з-за дакументаў студэнта В. З. Шарапы, які пачаткова вучыўся на заатэхнічным факультэце, а з 1.09.1952 г. быў пераведзены на аграфак. Такім чынам, ГСГІ павінен быў выдаць 66 дыпломаў заатэхнікаў, што на 20 менш, чым атрымалі выпускнікі агранамічнага факультэта ў 1956 г.

Калі зыходзіць з архіўнай справы, то на першы курс заатэхнічнага факультэта ГСГІ у 1951 г. было залічана 66 чалавек. За пяць гадоў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

студэнцкі калектыў фактычна не змяніўся. Страта за кошт згаданага вышэй студэнта, якому дазволілі перайсці на агранамічны факультэт, была кампенсавана дзякуючы пераводу ў ГСГІ ў 1954 г. з Ульянаўскага сельскагаспадарчага інстытута студэнткі Г.В. Чэхронавай.

*Узрост.* Спектр гадоў нараджэння выпускнікоў заатэхнічнага факультэта 1956 г. выяўляў даволі значную разбежку – ад 1914 г. да 1935 г. Узроставы падзел нівеліраваўся нязначнай колькасцю тых, хто належаў да старэйшай групы (па адным студэнце 1914 г., 1923 г., 1924 г., 1926 г. нараджэння, два студэнты – 1925 г.). Адзін студэнт быў 1929 г. нараджэння, але найбольш масава былі прадстаўлены сярод выпускнікоў 1956 г. тыя, хто нарадзіўся ў 1930-1933 гг. (1930 г. – 9 чалавек, 1931 г. – 12, 1932 г. – 20, 1933 г. – 14). Адпаведна, на момант падачы заяваў большасць будучых першакурснікаў была ва ўзросце ад 18 да 21 гадоў. Трое студэнтаў былі 1934 г. нараджэння, адзін – 1935 г. На заатэхнічным факультэце вучыўся самы ўзроставы студэнт у інстытуце – Р. А. Трошаў, які на момант падачы дакументаў у інстытут меў 36 гадоў.

*Пол.* Як сведчыць склад выпускнікоў заафака 1956 г. ГСГІ, прафесія вучонага заатэхніка мела выразна жаночае аблічча. З 66 выпускнікоў-заатэхнікаў да жаночага полу адносіліся – 38, мужчынскага – 28 чалавек. Для параўнання, сярод выпускнікоў-аграномаў жанчыны складалі толькі 40 %. Дзякуючы студэнткам-заатэхнікам, увесь выпуск спецыялістаў ГСГІ у 1956 г. выглядаў сбалансавана з перспектывы палавой рэпрэзентацыі. Дарэчы, больш дзясятка студэнтак-заатэхнікаў за час навучання змянілі сваё сямейнае становішча і, адпаведна, перайшлі на прозвішча мужа.

*Нацыянальнасць.* Згадка пра нацыянальнасць была адным з анкетных пунктаў у асабістай дакументацыі часоў СССР. У аўтабіяграфіях, якія падаваліся абітурыентамі пры паступленні, такая інфармацыя была пажаданай (пра што сведчаць дадатковыя паметкі), але неабавязковай. Беларускае паходжанне, паводле асабістых спраў, мелі 29 выпускнікоў. Сярод выпускнікоў было пяць палякаў і адна ўкраінка. Дзве асобы былі рускімі па нацыянальнасці. Свядома ці не, але ў справах 29 чалавек адсутнічалі звесткі пра нацыянальнасць. Большасць з іх, калі сыходзіць з месца нараджэння, былі беларусамі, рэшта – рускімі. Этнічны склад студэнтаў-заатэхнікаў, як і аграномаў, не даваў падстаў для супярэчнасцей на нацыянальнай глебе. Адзначыць можна таксама тое, што базавая сярэдняя адукацыя адрознівалася па мове: частка выпускнікоў скончыла беларускамоўныя школы (у Навагрудку, Нясвіжы і інш.), частка – рускамоўныя (у Клецку). Заявы на паступленне ў ГСХІ падаваліся на рускай мове, але, як сведчыў прыклад аўтабіяграфіі М. В. Лысухі, беларускую мову ў інстытуце не ігнаравалі.

*Месца нараджэння і жыхарства.* Студэнты-заатэхнікі другога выпуску ГСГІ пераважна былі ўраджэнцамі беларускіх вёсак, але былі і тыя, хто нарадзіўся ў гарадах, у прыватнасці, у Мінску. Геаграфічна ў інстытуце на заатэхнічным факультэце былі прадстаўнікі дзесяці абласцей паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР на 1951 г. (Гродзенская, Брэсцкая, Баранавіцкая, Маладзечанская, Бабруйская, Палеская, Пінская, Мінская, Магілёўская і Віцебская вобласці). У большасці сваёй студэнты-заатэхнікі прадстаўлялі рэгіёны былой Заходняй Беларусі. Сярод выпускнікоў 1956 г. былі і ўраджэнцы РСФСР (Смаленскай, Бранскай і Растова-на Доне вобласці, Мардоўскай АССР). Уласна Гродзенскую область па стане на 1951 г. рэпрэзентавалі дзевяць чалавек, а найбольш было студэнтаў з Баранавіцкай вобласці (13 чалавек).

*Адукацыя.* Для паступлення ў ВНУ БССР патрабавалася пасведчанне аб сканчэнні сярэдняй школы з 10-гадовым тэрмінам навучання. Некаторыя ураджэнцы Заходняй Беларусі мелі вопыт навучання ў польскіх школах да 1939 г. Стаўленне да польскай адукацыі было падкрэслена негатыўнае: напр., адна са студэнтак пісала ў аўтабіяграфіі: "*За кожнае няправільна вымаўленае польскае слова нас білі*". Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, большасць тых, хто паступаў у 1951 г., атрымалі пасведчанне аб сярэдняй адукацыі ў тым жа годзе. Сярод студэнтаў і, адпаведна, выпускнікоў заатэхнічнага факультэта 1956 г. былі ажно гадаванцы Гродзенскай фельчарска-акушэрскай школы, якія мелі кваліфікацыю "правізар". Толькі адзін з выпускнікоў 1956 г. меў сярэднюю спецыяльную адукацыю па профілі ГСГІ (Трошаў Р. А. – малодшы заатэхнік, Себежскі заатэхнічны сельскагаспадарчы тэхнікум буйной рагатай жывёлы, 1937 г.). Ён жа меў фактычна вышэйшую адукацыю, якую атрымаў за час навучання на двухгадовых вячэрніх курсах універсітэта марксізму-ленінізму пры Гродзенскім гаркаме КПБ(б). Яшчэ адна асоба паступіла ў свой час у Растоўскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, але не скончыла навучанне.

*ГСГІ як альтэрнатыва і лёс.* Сярод тых, хто скончыў у 1956 г. заатэхнічны факультэт, амаль траціна пачаткова не звязвала свой лёс з сельскай гаспадаркай. Такую выснову можна зрабіць з таго, куды да ГСГІ будучыя заатэхнікі падавалі свае дакументы. У педагагічныя інстытуты ў Гродна, Мазыр, Брэст, Магілёў, Баранавічы паспрабавалі паступіць і не прайшлі па конкурсе восем чалавек. Таксама з 1951 г. атрымлівалі вышэйшую адукацыю на заатэхнічным факультэце ГСГІ тыя, хто не здолеў паступіць у прэстыжныя сталічныя ВНУ – Белдзяржуніверсітэт, Беларускі палітэхнічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны інстытут культуры, Мінскі медыцынскі інстытут і Мінскі юрыдычны інстытут, а таксама ВНУ іншых рэспублік СССР, у прыватнасці – Крыварожскі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

горнарудны інстытут. Для параўнання, толькі двое выпускнікоў заатэхнічнага факультэта ГСХІ спачатку спрабавалі прабіцца ў лік студэнтаў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Акрамя таго, многія, хто ў выніку атрымаў дыплом вучонага заатэхніка ў ГСГІ, у сваіх заявах выказвалі жаданне паступаць на агранамічны факультэт. Усё гэта сведчыць як пра завышаную самаацэнку, так і пра даволі стракаты характар інтарэсаў студэнтаў-заатэхнікаў. Аднак выкладчыцкі калектыў ГСХІ за пяць год "*пераплавіў*" чалавечы матэрыял у патрэбным кірунку.

*Сацыяльнае паходжанне*. Патрабаванні савецкай эпохі змянялі свядомасць людзей, якія былі вымушаныя прыстасоўвацца да існуючых умоў дзеля будучага сацыльнага росту. Савецкая ўлада адкрыта спрыяла прадстаўнікам так званых працоўных мас, у тым ліку сялянам, дзеці якіх складалі большасць студэнтаў ГСГІ. У шэрагу аўтабіяграфій будучых выпускнікоў ГСГІ быў зроблены акцэнт на бядняцкім статусе бацькоў (толькі аднойчы – серадняцкім), часам нават указваліся памеры зямлі, якой валодала сям'я. Агульным у аўтабіяграфіях выхадцаў з вёскі было згадванне пра тое, што бацькі працуюць у калгасе. Акрамя прадстаўнікоў сялянства, сярод заатэхнікаў набору 1951 г. былі дзеці служачых, працоўных (у тым ліку настаўнікаў), а таксам кіраўнікоў партыйных і савецкіх органаў (раённага райкама партыі, райвыканкама). Студэнтамі заатэхнічнага факультэта былі члены сем'яў савецкіх адказных работнікаў (супрацоўнікаў Гродзенскага абласнога выканкама). Аднак "правільнае" паходжанне было пэўнай гарантыяй лаяльнасці да ўлады, але не адэкватных паводзінаў у цэлым, як сведчаць дысцыплінарныя вымовы для некаторых безадказных студэнтаў.

*Вайна*. Праз лёс усіх выпускнікоў 1956 г. прайшлі падзеі Другой сусветнай вайны. Большая частка студэнтаў перажылі нямецкую акупацыю з бацькамі, якія займаліся сельскай гаспадаркай. У многіх бацькі былі на фронце, некаторыя – не вярнуліся з вайны. Сваякі многіх студэнтаў актыўна ўдзельнічалі ў партызанскім руху. Сярод выпускнікоў-заатэхнікаў былі сапраўдныя героі-партызаны: Т.Х. Горава (Талапіла), узнагароджаная медалямі "За баявыя заслугі", "Партызану Айчыннай вайны" другой ступені, "За перамогу над Германіяй". Акрамя таго шэраг выпускнікоў 1956 г. старэйшага ўзросту ваявалі ў складзе рэгулярнай арміі. Напрыклад, А. А. Кужалевіч, удзельнік баёў ва Усходняй Прусіі, інвалід вайны. Вялікі вайсковы досвед быў у лейтэнанта запасу Трошава Р. А., які паўдзельнічаў у вайне з японцамі (ля Халхін-Гола), савецка-фінскай вайне, Вялікай Айчыннай вайне і быў узнагароджаны ордэнам "Чырвонай Зоркі" і шэрагам медалёў.

*Высновы.* Выпуск заатэхнічнага факультэта 1956 г. стаў першым маштабным унёскам ГСГІ у падрыхтоўку кадраў для беларускай савецкай сельскай гаспадаркі. За час навучання 1951–1956 гг. склад студэнцкага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

калектыва амаль не змяніўся, што сведчыла пра жаданне паступіўшых атрымаць вышэйшую адукацыю. Студэнцкі калектыў заатэхнічнага факультэта быў шматнацыянальным, але большасць складалі беларусы. Нягледзячы на стракатасць інтарэсаў, лёсаў і жыццёвага досведу, выпускнікі 1956 г. вызначаліся адной галоўнай рысай – уменнем працаваць у адпаведнасці з атрыманай прафесіяй. Доказам гэтаму з'яўляюцца толькі станоўчыя характарыстыкі з месцаў праходжэння студэнцкай практыкі. Выпуск 1956 г. сведчыў, што ГСГІ стаў навучальнай установай, якая здзяйсняе поўны цыкл падрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі БССР.

Спіс выпускнікоў агранамічнага факультэта 1956 г.
паводле архіўнага рэестра [2, аркушы без пагінацыі].

*Апанасовіч Ванда Вікенцеўна, Апанасовіч Ганна Міхайлаўна, Адамовіч Іосіф Іосіфавіч, Бусько Мікалай Іванавіч, Волкава Вера Піліпаўна, Вакульчык Марыя Іванаўна, Вашчанка Раіса Пятроўна, Варанец Пётр Антонавіч, Валчэцкі Міхаіл Іосіфавіч, Горава (Талапіла) Таццяна Харытонаўна, Гнідко Іван Іванавіч, Груцо Сяргей Антонавіч, Гаўрусік Валянціна Андрэеўна, Галезнік Марыя Іванаўна, Грынь Міхаіл Паўлавіч, Ганчарук (Жамойдзік) Валянціна Антонаўна, Гарноўская (Чэхронава) Ганна Васільеўна, Грышчанка (Шалухіна) Зоя Іванаўна, Дылевец Клаўдзія Юльянаўна, Дубіцкі Мікалай Сямёнавіч, Ермакова Ніна Іванаўна, Задохіна (Дзенісенка) Марыя Міхайлаўна, Дамброўская (Вярцінская) Надзея Ігнаіцьеўна, Драздоўская (Сенкевіч) Галіна Іванаўна, Качук Алена Уладзіміраўна, Малашчанка (Курловіч) Таццяна Афанасьеўна, Клімашонак Іосіф Ісакавіч, Касікоўская Марыя Казіміраўна, Кужалевіч Аркадзь Антонавіч, Кашкан Леакадзія Сцяпанаўна, Кірык Людміла Фёдараўна, Куксіна Тамара Іванаўна, Кухарава Ніна Андрэеўна, Кавалёў Леанід Іванавіч, Лысуха Марыя Васільеўна, Макарэвіч Уладзімір Андрэевіч, Марозава Клаўдзія Мікалаеўна, Мусік (Альфер) Аляксандра Іванаўна, Мечнік (Іаскевіч) Леаніда Ніканораўна, Мыслівец Марыя Ігнацьеўна, Акунь Аляксандр Андрэевіч, Пасталюк Міхаіл Іванавіч, Пузырэўская (Чыж) Раіса Іванаўна, Палонскі Іван Канстанцінавіч, Сяржанаў Дзіяген Аляксеевіч, Славецкая Леакадзія Іосіфаўна, Шкуда (Снітко) Марыя Іосіфаўна, Семянчук Мікалай Мікалаевіч, Сянкевіч Яўген Іванавіч, Тагай (Лобан) Вольга Арсеньеўна, Трошаў Рыгор Аляксандравіч, Трамбачова Ніна Пятроўна, Тычына Іосіф Спірыдонавіч, Тумар Дзіна Васілеўна, Фешчанкова Таццяна Маісееўна, Халько Дзмітрый Ігнацьевіч, Хрушч Станіслаў Сяргеевіч, Харэвіна Марыя Андрэеўна, Журкевіч Рыгор Стахіевіч, Жулега Антон Трафімавіч, Ус Іван Людвікавіч, Шкурко Мікалай Сцяпанавіч, Шафар Павел Пятровіч, Чудоўская Нэлі Іванаўна, Ярац Любоў Несцераўна, Ясюкевіч Уладзімір Уладзіміравіч.*

КРЫНІЦЫ

1. Гродненский государственный аграрный университет 1951–2001. 50 лет. – Гродно: ГОУПП «Гродненская типография», 2001. – 224 с.
2. ALMA MATER: Гродненский государственный аграрный университет. Традиции, история, современность. – Гродно: Гродненская типография, 2011. – 128 с.
3. Архіў УА «ГДАУ». – Асабістыя справы студэнтаў заафака выпуску 1956 года. – Спр. № 03. – 615 арк.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ